# МУЗЕЯЗНАЎСТВА

УДК 355.233.231.1-053.5:069.12

*Г. А. Машнюк*

## Праблемы патрыятычнага выхавання дзіцячай аўдыторыі ў працы музеяў

*Разглядаюцца геапалітычныя і сацыякультурныя працэсы, якія паўплывалі на развіццё музейнай справы праз змены ў гістарычнай палітыцы краін постсавецкай прасторы ў канцы XX – пачатку XXI ст. Прааналізаваны фактары працэсаў глабалізацыі, якія мелі станоўчы і адначасова адмоўны ўплыў на культурнае жыццё грамадства ў трасфармацыйны перыяд, на развіццё музея як цэнтра культуры. Сцвярджаецца, што адаптацыя музеяў да патрэб грамадства засноўваецца на супрацоўніцтве з іншымі сацыяльнымі інстытутамі. Асаблівасці міжінстытуцыянальнай партнёрскай дзейнасці ў сферы патрыятычнага выхавання дзяцей паказаны на прыкладзе працы Дзіцячага музея – філіяла Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.*

***Ключавыя словы:*** *глабалізацыя, лічбавізацыя, гістарычная палітыка, партыцыпацыя, патрыятычнае выхаванне, нацыянальная самасвядомасць, дзіцячы музей, г. Полацк.*

*G. Mashniuk*

## Problems of patriotic education of the children's audience in the work of museums

*The article examines the geopolitical and sociocultural processes that influenced the development of museums through changes in the historical policies of the countries of the post-Soviet space at the end of the 20th – beginning of the 21st centuries. The author analyzes the factors of globalization processes that had a positive and at the same time negative impact on the cultural life of society during the transformation period, on the development of the museum as a cultural center. It is argued that the adaptation of museums to the needs of society is based on cooperation with other social institutions. The features of interinstitutional partnership activities in the field of patriotic education of children are shown using the example of the work of the Children's Museum – a branch of the National Polotsk Historical and Cultural Museum-Reserve.*

*Keywords: globalization, digitalization, Historical policy, patriotic education, national identity, partisanship, children's museum.*

Усёахопныя змены, якія адбыліся напрыканцы XX ст., а менавіта распад Савецкага Саюза, пераход ад біпалярнага свету да фарміравання но-

вай палітычнай структуры і ўключэння постсавецкіх рэспублік у сусветныя працэсы глабалізацыі, адбіліся на дзейнасці музеяў як культурных інстытутаў грамадства і істотна паўплывалі на развіццё музейнай справы.

Канец XX – пачатак XXI ст. – якасна новы этап у развіццi музеязнаўства на постсавецкай прасторы. Пашыраліся навуковыя кантакты з заходнімі калегамі, магчымасці знаёмства з іх працамі, ствараліся дзіцячыя музейныя цэнтры пры вялікіх музеях, самастойныя дзіцячыя музеі. Распад Савецкага Саюза і блока сацыялістычных краін Усходняй і Цэнтральнай Еўропы змяніў не толькі палітычнае становішча ў свеце, але адбыліся фундаментальныя змены ў іх ідэалогіі, культуры і гістарычнай палітыцы. Са станаўленнем нацыянальна-дзяржаўнай гістарыяграфіі былых рэспублік Савецкага Саюза фарміравалася гістарычная палітыка краін постсавецкай прасторы. Паралельна ішоў працэс сацыякультурнай трансфармацыі музеяў, што ў спалучэнні з новымі кірункамі гістарычнай палітыкі прывяло да змен у працы з дзіцячай аўдыторыяй.

*Мэта артыкула* – выявіць уплыў сацыякультурных змен постсавецкага перыяду на актуалізацыю патрыятычнага выхавання дзяцей і моладзі ў працы сучасных музеяў. Для раскрыцця гэтай мэты варта паказаць, як арганізавана дзейнасць музейных устаноў Рэспублікі Беларусь.

Праблемы гістарычнай палітыкі, яе адлюстраванне ў музеях гістарычнага профілю цікавілі беларускіх, расійскіх і ўкраінскіх даследчыкаў: Л. І. Ражкову [25], К. А. Зверава [7; 8], А. В. Увараву [31], П. Старкуса, Э. Б. Боева [30], Ю. З. Кантор [10].

Сацыякультурныя трансфармацыі, якія адбываліся ў канцы XX – пачатку XXI ст., разглядаюцца ў артыкулах У. І. Саладухіна [28], В. А. Баравіковай [2]. А. А. Лісенкова ў манаграфіі «Трансфармацыя сацыякультурнай ідэнтычнасці ў лічбавай прасторы» паказала ўплыў на сучаснае грамадства лічбавых віртуальных тэхналогій [15].

Змены ў дзейнасці музеяў у кантэксце трансфармацыі сацыякультурных парадыгм адлюстраваны ў працах А. Ю. Папроцкай [21; 22], А. Н. Бухал [3], А. М. Масценіцы [17], Н. А. Пачобут [23]. Адным з фактараў, які падштурхнуў да актывізацыі працы з дзіцячай аўдыторыяй, у тым ліку і ў спецыялізаваных дзіцячых музеях, стала прымяненне метадаў музейнай педагогікі ў культурна-адукацыйнай дзейнасці [1; 23]. Аналіз метадаў музейнай педагогікі ў сферы патрыятычнага выхавання дзяцей адлюстраваны ў працах С. У. Фёдаравай [32], А. Я. Жыткова [6], І. Р. Ібетавай, Н. М. Калацкай [9], А. А. Мардзвінавай [18].

Пытанні прымянення патрыятычнага выхавання ў дашкольных і школьных установах адукацыі даследавалі Ю. М. Шыпценка [34], С. М. Шаўцова, В. А. Шаўцова [33]. Т. Р. Смірнова разглядае праблемы па-

трыятычнага выхавання дашкольнікаў на прыкладзе працы Дзіцячага музея г. Полацка [26].

З распадам сацыялістычнага блока і развалам Савецкага Саюза ў былых постсавецкіх краінах адбываліся працэсы паступовай пераарыентацыі і адыходу ад савецкага ўзору ў культурнай і гістарычнай палітыцы. У гістарычнай палітыцы краін Усходняй Еўропы і часткова постсавецкіх у трансфармацыйны перыяд адбывалася пераасэнсаванне «цёмных старонак» нядаўняй гісторыі. Такой рэфлексіяй над таталітарным мінулым сталі музеі, прысвечаныя былым спецслужбам. Так, у былых краінах сацыялістычнага лагера былі створаны музей Штазі (Берлін, Германія), Дом тэрору (былая штаб-кватэра таемнай паліцыі у Будапешце, Венгрыя), Музей акупацый (Талін, Эстонія). Варта заўважыць, што напачатку дзейнасці дадзеныя музеі мелі ў вялікай ступені асветніцкі характар, а пазней набылі турыстычна-камерцыйны [25, с. 209–210].

У канцы 1980-х гг. яскрава праявіліся змены ў гістарычнай палітыцы постсавецкіх рэспублік. Адной з галоўных мэт прыбалтыйскіх рэспублік стаў выхад з Савецкага Саюза і пошук адпаведнай ідэалагічнай асновы. Акрамя існавання міжваеннага перыяду незалежнасці (1918–1940), вялікім штуршком для гэтага стала апублікаванне пакта Молатава–Рыбентропа. Для прыбалтыйскіх незалежніцкі настроеных колаў гэта стала яшчэ адным фактам пацвярджэння нелегітымнага ўваходжання ў склад СССР у 1940 г. Пасля аднаўлення суверэнітэту Латвія ў Канстытуцыі прапісала сваю пераемнасць ад Латвійскай Рэспублікі, а не Савецкай Сацыялістычнай. Першая палова 1990-х гг. у краіне адзначалася зносам помнікаў савецкім дзеячам (напрыклад У. І. Леніну). Акрамя Музея акупацый у мэтах пераасэнсавання латвійскай культурна-гістарычнай палітыкі з'явілася ідэя стварэння Музея нацыянальнай памяці [7, с. 172; 10, с. 1070; 30, с. 107].

У Эстоніі адбываліся аналагічныя працэсы. Як і ў Латвіі, вялася «вайна помнікаў». Узгадаем вядомы эпізод аб пераносе «Бронзавага салдата» ў 2007 г. з адной з цэнтральных плошчаў Таліна на Ваенныя могілкі [8, с. 212]. У 2003 г. у Таліне быў адкрыты Музей акупацый (Музей акупацый і свабоды Vabamu), дзе галоўным лейтматывам стала тэма свабоды і барацьба за незалежнасць ад СССР [31, с. 532].

Адпраўным пунктам змены гістарычнай палітыкі Украіны стаў Еўрамайдан (2013–2014), з якога пачаўся «Ленінапад». Руйнаванне помнікаў У. І. Леніну, з пункту гледжання дзяржаўнай палітыкі, сімвалізуе разрыў з камуністычным мінулым.

Можна зрабіць выснову, што змены ў гістарычнай палітыцы былых савецкіх рэспублік абумоўлены пошукам ідэалагічнага канструкту аднoўленых дзяржаў у канцы XX – пачатку XXI ст. За аснову браліся

тэзісы пра «залаты век» – перыяд несавецкай (буржуазнай) дзяржаўнасці 1920–1940-х гг. і ў сваю чаргу часткова ці поўны антаганізм савецкай эпохі ў нацыянальных гістарыяграфічных школах і ў музейнай справе. Толькі ў Беларусі, Расіі і часткова ва Украіне (да 2014 г.) адбываўся працэс акумуляцыі гістарычнай памяці. Музей набыў ролю сацыякультурнага інстытута па захаванні нацыянальнай памяці, які фарміруе і грамадскую думку [7, с. 164; 11, с. 193; 31, с. 533].

Змены ў гістарычнай палітыцы поўнасцю змянілі ідэалагічны базіс былых сацыялістычных і постсавецкіх краін, што ў першую чаргу адлюстравалася на палітыцы патрыятычнага выхавання маладога пакалення. Асноўнымі інстытутамі грамадства, на якія была ўскладзена адказная роля за выхаванне дзяцей і моладзі, сталі ўстановы адукацыі, культуры, у тым ліку музей. Падкрэслім, што змена ідэалагічнага фактару ў некаторых былых сацыялістычных краінах, у якіх гістарычная палітыка «завязана» на пэўны антаганізм савецкасці, прывёў да радыкалізацыі ў сферы патрыятычнага выхавання і папулярызацыі кардынальных нацыяналістычных ідэй у маладых людзей. Асабліва такія тэндэнцыі яскрава назіраліся ў парамілітарных маладзёжных аб’яднаннях.

Працэс глабалізацыі меў не толькі пазітыўныя, але і негатыўныя праяўленні. Да ліку апошніх адносіцца вестэрнізацыя культуры, г. зн. змена традыцыйных культурных парадыгм на заходнія. Прыкладам гэтага можна назваць папулярызацыю масавай заходняй (амерыканскай) поп-культуры: фільмаў, музыкі, кніг, відэагульняў, якія пачалі масава спажываць былыя постсавецкія грамадствы. Новы культурны кантэнт, асабліва замежнага паходжання, моладзь успрымала з лёгкасцю. Як адзначаюць даследчыкі, у вялікай колькасці выпадкаў замежныя культурныя прадукты былі не самай лепшай якасці (напрыклад кінастужкі катэгорыі Б), але іх паходжанне перакрэслівала ўсе хібы для моладзі, якая арыентавалася на каштоўнасці заходняй цывілізацыі. Да такіх замежных кантэнтаў можна аднесці культуру кансьюмерызму, дзе галоўнай мэтай стварэння культурнага прадукту была не мастацкая якасць, а рэнтабельнасць і яго пашырэнне [14, с. 260; 28, с. 198].

З іншага боку, акрамя вестэрнізацыі і пераймання культурных практык (не тыповых для грамадства), адбываліся пазітыўныя працэсы. Адным са здабыткаў глабалізацыі з’яўляецца лічбавізацыя [2, с. 20]. Новая форма музейнай камунікацыі, якая пачала ажыццяўляцца з наведвальнікамі з дапамогай Інтэрнэту, адкрыла акно магчымасцей для захавання, назапашвання і папулярызацыі традыцыйнай культуры. Многія музеі алічбоўваюць і публікуюць музейныя калекцыі, якія знаходзяцца ў вольным доступе на інтэрнэт-старонках для ўсіх карыстальнікаў. Палітыка знаёмства з музейнымі калекцыямі не выходзячы з дому дала станоўчыя вынікі ў перыяд пандэміі COVID-19. Каб не страціць сувязі з асноўнай музейнай аўдыторыяй па прычы-

не каранцінных абмежаванняў і прыцягнуць яе ўвагу, пляцоўкай камунікацыі сталі выступаць інтэрнэт-сайты музеяў і сацыяльныя сеткі.

Дзіцячы музей – філіял Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка (далей – НПГКМЗ) выкарыстаў такую магчымасць, каб публікаваць на сваім сайце ў рубрыцы «Гульнявая старонка» анлайн-заняткі. Тэмы анлайн-заняткаў былі непасрэдна звязаны з выстаўкай і тэматыкай экспазіцыйных комплексаў музея, матэрыялы падбіраліся з улікам узроставых груп наведвальнікаў: для дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту, малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту.

Асаблівасць дзейнасці музеяў у трансфармацыйны перыяд – пошук сучасных метадаў працы з аўдыторыяй з улікам рычагоў маркетынгу, шляхоў развіцця культурна-адукацыйнай работы ў межах, якія вызначае інфармацыйная цывілізацыя. Дадзены працэс адаптацыі звязаны як са зменамі ў сацыякультурнай ідэалагічнай, гістарычнай палітыцы, так і з новай эканамічнай рэальнасцю, дзе на змену планавай эканоміцы з дзяржаўным кіраваннем прыйшла рыначная з канкурэнтнай барацьбой за спажыўца. Музеі пачалі камерцыялізавацца дзеля эканамічнай незалежнасці (напрыклад у ЗША), вялікая роля надавалася рэкрэацыі для наведвальнікаў. У дадзеных абставінах іншым шляхам развіцця стала канцэпцыя палітыкі супрацоўніцтва музеяў з рознымі арганізацыямі ў межах горада, з грамадскімі інстытутамі, у ліку якіх школа, дзіцячыя садкі [3, с. 62; 17, с. 18–19; 21, с. 142; 22, с. 37].

У канцы 1990 – пачатку 2000-х гг. адбываўся працэс вяртання сацыяльных інстытутаў грамадства да працы па патрыятычным выхаванні моладзі. Адказнасць за аднаўленне дадзенай практыкі ўзялі на сябе дзяржаўныя кіруючыя структуры, якія на нацыянальным ўзроўні абгрунтавалі патрэбу патрыятычнага выхавання моладзі. У першай чвэрці XXI ст. у Рэспубліцы Беларусь былі прыняты заканадаўчыя дакументы, у якіх прапісаны меры па патрыятычным выхаванні дзяцей і моладзі: Канцэпцыя бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь (2006 і 2015 гг.) [12; 19], Праграма бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі на 2021–2025 гг. (2021) [24], Канцэпцыя развіцця нацыянальнай культурнай прасторы ва ўсіх сферах жыцця грамадства на 2024–2026 гг. (2023) [13].

Сёння развіццё патрыятычнага выхавання моладзі адбываецца на розных узроўнях і мае міжінстытуцыянальны характар. Напрыклад, метадамі музейнай педагогікі карыстаюцца не толькі музеі, але і дашкольныя ўстановы, установы адукацыі, у тым ліку і Расійскай Федэрацыі, дзе на дзяржаўным узроўні падтрымліваецца патрыятычнае выхаванне моладзі [32, с. 111–112].

Установы адукацыі і культуры супрацоўнічаюць у сферы патрыятычнага выхавання. Вынікам супрацоўніцтва з’яўляецца стварэнне спе-

цыяльных праграм па патрыятычным выхаванні, накіраваных на працу з дзецьмі рознага ўзросту, пачынаючы ад дашкольнікаў да студэнтаў. Патрыятычнае выхаванне дзіцячай аўдыторыі дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту адбываецца ў кантэксце знаёмства з гісторыяй малой радзімы ці горада праз выкарыстанне культурна-адукацыйных практык: пешаходных экскурсій, наведванне музеяў, праца школьных музеяў, міні-музеяў пры ўстановах дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі [33, с. 67–68; 34, с. 36].

Праблемнае пытанне патрыятычнага выхавання дзяцей дашкольнага і школьнага ўзросту праз выкладанне гісторыі роднага краю і выкарыстанне з гэтай мэтай музейнай прасторы разглядаецца А. Я. Жытковым. Аўтар прыходзіць да высновы, што калі дзецям не залажыць базавыя гістарычныя ідэі, якія фарміруюць ідэнтычнасць, то веданне як лакальнай, так і нацыянальнай гісторыі становіцца бессэнсоўным для будучых маладых пакаленняў, узнікае абыякавасць, якая не садзейнічае фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці [6, с. 28–29]. Маладыя людзі ў сілу розных фактараў, асабліва псіхалагічнага развіцця, успрымаюць разнастайную па якасці інфармацыю, у тым ліку гістарычную, з лёгкасцю, як губка, пераважна без крытычнага аналізу. Маладое пакаленне, асабліва дзеці, уяўляюць сабою «tabula rasa» – «чысты ліст», на якім могуць быць напісаны любыя культурныя коды і практыкі, нават дэструктыўнага характару. Таму праца па патрыятычным выхаванні моладзі, і асабліва дзяцей на самых ранніх этапах, з’яўляецца першаснай у дзейнасці музея як аднаго з базавых інстытутаў грамадства [9, с. 193].

Некаторыя дашкольныя ўстановы ствараюць уласныя музейныя экспазіцыі, зробленыя на аснове рэканструкцый, інсталяцый, інтэрпрэтацый гістарычных падзей (парамузеі), прысвечаныя гісторыі пэўнага горада ці рэгіёна. Вялікая ўвага ў іх надаецца перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Культурна-адукацыйная дзейнасць школьных музеяў накіравана на культурна-выхаваўчую працу з навучэнцамі, патрыятычнае выхаванне [16, с. 146; 20, с. 221]. Адзначым, што ў парамузеях экспануюцца не сапраўдныя гістарычныя прадметы, а іх копіі, якія ілюструюць якія-небудзь падзеі, традыцыі, а таксама аб’екты/прадметы, якія не маюць матэрыяльнай ці гісторыка-культурнай каштоўнасці. Музеі адрозніваюцца ад такіх устаноў музейнага тыпу як напаўненнем прадметамі музейнага значэння, так і музейна-фондавай працай, дакументазваротам, а самае галоўнае – наяўнасцю арыгінальных гістарычных прадметаў.

Дарэчы, каб адпавядаць выклікам сучаснасці, музей павінен стаць грамадска-арыентаваным інстытутам, карысным, актуальным і зразумелым. Дзіцячы музей (філіял НПГКМЗ) праводзіць сумесную працу з дашкольнымі ўстановамі г. Полацка і з’яўляецца прыкладам міжінстытуцыянальнай працы. У выніку ўзаемадзеяння з Дзіцячым

садам № 29 г. Полацка з’явіўся сумесны праект «Каб памяталі…». Напярэдадні Дня Перамогі супрацоўнікі Дзіцячага музея праводзяць музейна-педагагічныя заняткі, прысвечаныя падзеям Вялікай Айчыннай вайны, сярод выхаванцаў старэйшага дашкольнага ўзросту з выкарыстаннем як прадметаў з музейнага збору НПГКМЗ, так і з дапамогай мультымедыйнай тэхнікі [29].

У 2022 г. у Дзіцячым музеі працавала часовая выстава «Дзеці вайны», якая адлюстравала лёсы і выпрабаванні дзяцей з Полаччыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны. На музейна-педагагічных занятках па тэме «Дзеці вайны» наведвальнікі даведаліся пра лакальную гісторыю ваеннага ліхалецця: эвакуацыю больш за сотні маленькіх выхаванцаў Дзіцячага дома імя К. М. Самойлавай пад кіраўніцтвам загадчыцы Паліны Сяргееўны Партновай з чэрвеня 1941 г. па верасень 1945 г.; жыццё ў акупацыі дзіцячага дома ў в. Быкаўшчына Полацкага раёна; правядзенне партызанамі аперацыі «Зорачка» па выратаванні дзяцей з в. Бельчыца Полацкага раёна ў красавіку 1944 г. падчас карнай аперацыі нацыстаў «Зімовае чараўніцтва» па ліквідацыі Полацка-Лепельскай партызанскай зоны [5].

У Дзень народнага адзінства (17 верасня 2022 г.) на будынку Дзіцячага сада № 24 г. Полацка была адкрыта мемарыяльная дошка ў гонар педагога П. С. Партновай (пазней дашкольнай установе прысвечана імя П. С. Партновай). У Дзіцячым садзе працавала часовая выстава, прысвечаная эвакуацыі дзяцей Дома дзіцяці імя К. М. Самойлавай пад кіраўніцтвам загадчыцы П. С. Партновай у чэрвені 1941 г. з Полацка ў Чувашскую АССР, падрыхтаваная з удзелам супрацоўнікаў Дзіцячага музея – філіяла НПГКМЗ [4; 26, с. 154].

Такім чынам, геапалітычныя змены (распад Савецкага Саюза, сацыялістычнага блока) змянілі культурную палітыку ў цэлым і музеяў у прыватнасці. Дадзеныя працэсы адбываліся ў ходзе змены ідэалогіі і гістарычнай палітыкі постсавецкіх і постсацыялістычных дзяржаў. На працу музеяў як інстытутаў грамадства ўздзейнічала і глабалізацыя, якая якасна ўплывала на культурнае жыццё грамадстваў. Глабалізацыйныя працэсы мелі амбівалентны характар, на развіццё музеяў уздзейнічалі як пазітыўныя фактары, так і негатыўныя. Са зменай ідэалагічнага базісу перад музейнай супольнасцю востра паўстала пытанне далейшага развіцця. З паскоранай камерцыялізацыяй музеяў паўсталі праблемы захавання нацыянальнай ідэнтычнасці і стрымання націску дэструктыўных уплываў.

Адным з напрамкаў развіцця ў новых палітычных, эканамічных і ідэалагічных абставінах стала палітыка партыцыпацыі з іншымі інстытутамі грамадства. Такім супрацоўніцтвам стала сфера патрыятычнага выхавання дзяцей і моладзі, якую праводзілі і дзіцячыя музеі на мяжы XX–XXI стст. На сучасным этапе ў Рэспубліцы Беларусь дадзе-

ная палітыка падтрымліваецца органамі дзяржаўнай улады. Сёння патрыятычнае выхаванне з'яўляецца базавай асновай выхавання нацыянальнай ідэнтычнасці дзяцей і моладзі, у якой музеі, у тым ліку дзіцячыя, іграюць адну з галоўных роляў.

*1. Алиева, С. А.* Научно-педагогические основы патриотического воспитания учащейся молодежи средствами музейной педагогики / С. А. Алиева, С. З. Закарьяева, Р. В. Сулейманова // Проблема процесса саморазвития и самоорганизации в психологии и педагогике : сб. ст. по итогам Междунар. науч.-практ. конф., Калуга, 24 июня 2021 г. – Стерлитамак, 2021. – С. 3–5.

*2. Боровикова, В. О.* Информационно-технологическое будущее социального благополучия в 21-м веке / В. О. Боровикова // Непрерывное благополучие в мире : сб. науч. тр. Междунар. науч. симпозиума, Томск, 11–16 сент. 2016 г. / Нац. исслед. Томский политех. ун-т. – Томск, 2016. – С. 19–23.

*3. Бухал, Е. Н.* Образовательное пространство музея : тенденции развития в начале XXI века / Е. Н. Бухал // Вышэйшая школа. – 2021. – № 4 (144). – С. 61–64.

*4.* В сердцах полочан – память о подвиге в годы Великой Отечественной войны [Электронный ресурс] // Детский музей. – Режим доступа: http://children.polotsk.museum.by/node/64126. – Дата доступа: 31.01.2024.

*5.* Выставка «Военное детство» [Электронный ресурс] // Дзіцячы музей. – Режим доступа: http://children.polotsk.museum.by/node/61754. – Дата доступа: 31.01.2024.

*6. Житков, А. Е.* Детям о городе : формирование исторической памяти младших школьников / А. Е. Житков // Детство как антропологический, культурологический, психолого-педагогический феномен : материалы VII Междунар. науч. конф.: в рамках проекта «А.З.Б.У.К.А. детства», Самара, 24 дек. 2021 г. / отв. ред. Т. А. Чичканова. – Самара, 2022. – С. 27–34.

*7. Зверев, К. А.* Государственная историческая политика в современной Латвии / К. А. Зверев // Проблемы нац. стратегии. – 2020. – № 1 (58). – С. 163–177.

*8. Зверев, К. А.* Историческая политика Эстонской Республики в контексте национально-государственного строительства / К. А. Зверев // Проблемы нац. стратегии. – 2021. – № 1 (64). – С. 202–215.

*9. Ибетова, И. Р.* Гражданско-патриотическое воспитание обучающихся средствами музейной педагогики / И. Р. Ибетова, Н. Н. Калацкая // Психология и педагогика XXI века : актуальные вопросы, достижения и инновации : сб. ст. IV Всерос. студ. науч.-практ. конф. с междунар. участием, 16 марта 2023 г. / отв. ред. И. А. Ахметшина. – Орехово-Зуево, 2023. – С. 192–195.

*10. Кантор, Ю.* Девиации исторической политики в Восточной Европе и на постсоветском пространстве / Ю. Кантор // Quaestio Rossica. – 2021. – Vol. 9, № 3. – P. 1064–1079.

*11. Киридон, А.* Музеї як інструменти політики пам'яті / А. Киридон // Україна–Європа–Світ : міжнар. зб. наук. праць / Л. М. Алексієвець (голова ред.) [та ін.]. – Тернопіль, 2015. – Вип. 16 : у 2 ч., ч. 1. – С. 193–200.

*12.* Концепция непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи в Республике Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=2012&oldDoc=2007-29/2007-29(065-106).pdf&oldDocPage=4. – Дата доступа: 04.02.2024.

*13.* Концепция развития национального культурного пространства во всех сферах жизни общества на 2024–2026 годы [Электронный ресурс] : постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 28 дек. 2023 г., № 961 // Нац. правовой интернет-портал Респ. Беларусь. – Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=C22300961. – Дата доступа: 04.04.2023.

*14. Костенко, В. В.* Социокультурные изменения в процессе глобализации, их воздействие на молодежь и деятельность молодежных организаций / В. В. Костенко //

Социологический альманах. Вып. 14 : Трансформация социальной структуры современного общества : состояние, динамика, тенденции : материалы XIII Орловских социол. чтений, Орел, 3 дек. 2020 г. / сост. Е. К. Кондратова ; под общ. ред. П. А. Меркулова, А. А. Алексеенок. – Орел, 2021. – С. 259–265.

*15. Лисенкова, А. А.* Трансформация социокультурной идентичности в цифровом пространстве : моногр. / А. А. Лисенкова. – Пермь : ПГИК, 2021. – 286 с.

*16. Мамцева, Ю. Ю.* Роль школьного музея в гражданско-патриотическом воспитании школьников / Ю. Ю. Мамцева // Качество современного образования : традиции, инновации, опыт реализации : сб. материалов VII Всерос. науч.-практ. конф., Ставрополь, 26 апр. – 15 мая 2021 г. – Ставрополь, 2021. – С. 146–149.

*17. Мастеница, Е. Н.* Актуализация культурного наследия в музее : вызовы современности / Е. Н. Мастеница // Вестн. Кемеровского гос. ун-та культуры и искусств. – 2020. – № 50. – С. 14–21.

*18. Мордвинова, Е. А.* Воспитательные возможности музейной педагогики в работе с детьми и родителями (из опыта работы по патриотическому воспитанию школьников на базе музеев и музейных зон МБОУ школы № 157 г. Самара) / Е. А. Мордвинова, С. В. Хожателева // Науч. альманах. – 2021. – № 7–1 (81). – С. 54–60.

*19.* Об утверждении концепции непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи [Электронный ресурс] : постановление М-ва образования Респ. Беларусь, 15 июля 2015 г., № 82. – Режим доступа: https://www.msu.by/info/ovrsm/norm_dok/konc_nvdum.pdf. – Дата доступа: 04.04.2023.

*20. Орда, О. В.* Нравственно-патриотическое воспитание дошкольников средствами музейной педагогики / О. В. Орда, Л. И. Недик // IV Междунар. профессионально-исслед. конкурс «Педагогическое призвание» : сб. ст., Петрозаводск, 24 февр. 2022 г. – Петрозаводск, 2022. – Ч. 1. – С. 220–224.

*21. Папроцкая, А. Ю.* Стратегии развития музея XXI века как социокультурного феномена / А. Ю. Папроцкая // Охрана и популяризация культурного наследия : мировой и отечественный опыт : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 22–23 окт. 2021 г. / Витебский гос. ун-т им. П. М. Машерова ; редкол.: А. Н. Дулов (отв. ред.) [и др.]. – Витебск, 2021. – С. 140–143.

*22. Папроцкая, А. Ю.* Стратегия как основа продвижения музея XXI века / А. Ю. Папроцкая // История и культура. – 2022. – № 3. – С. 35–40.

*23. Почобут, Н. А.* Формирование общего образовательного пространства музея и школы в конце 1990 – начале 2000-х гг. / Н. А. Почобут // История и культура. – 2022. – № 2. – С. 63–69.

*24.* Программа непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи на 2021–2025 гг. [Электронный ресурс] : постановление М-ва образования Респ. Беларусь, 31 дек. 2020 г., № 312. – Режим доступа: https://adu.by/images/2023/vosp/programma-vospitaniya-2021-2025.pdf. – Дата доступа: 04.04.2023.

*25. Рожкова, Л. І.* Пам'ять про тоталітаризм у меморіально-мистецькому просторі : європейський досвід / Л. І. Рожкова // Соціально-економічні, політичні та гуманітарні виміри національного та місцевого розвитку : зб. наук. ст. учасників другої Всеукр. наук.-практ. конф. / редкол. : С. В. Степаненко (голова ред.) [та ін.]. – Полтава, 2020. – С. 209–215.

*26. Смирнова, Т. Р.* Образовательные проекты как одна из форм социального партнерства в вопросах нравственно-патриотического воспитания детей дошкольного возраста (из практики работы Детского музея) / Т. Р. Смирнова // Музей. Спадчына. Памяць : зб. дакладаў дзелавой праграмы V Нац. форуму «Музеі Беларусі», Мінск, снеж. 2022 г. / рэд. С. А. Байкоў. – Мінск : Белстан, 2023. – С. 148–157.

*27. Солдатова, О. Н.* Историческая память как важнейший элемент конституционного строительства в Республике Беларусь / О. Н. Солдатова, Т. А. Пранник // Развитие теории и практики управления социальными и экономическими системами : материалы Одиннадцатой междунар. науч.-практ. конф., Петропавловск-Камчатский, 26–27 мая 2022 г. / отв. за вып. А. О. Шуликов. – Петропавловск-Камчатский, 2022. – С. 13–17.

*28. Солодухин, В. И.* Проблемы этнокультурного развития молодежи в условиях глобализации и цифровизации / В. И. Солодухин // Актуальные проблемы развития экономики, прикладной информатики, конфликтологии, рекламы и социально-культурных технологий в цифровую эпоху : сб. науч. докладов Регион. науч.-практ. конф., Москва, 8 апр. 2020 г. – М., 2020. – С. 193–199.

*29.* Сохраняем память о подвигах наших дедов! [Электронный ресурс] // Детский музей. – Режим доступа: http://children.polotsk.museum.by/node/55441. – Дата доступа: 31.01.2024.

*30. Старкус, П.* Образ советского прошлого в исторической памяти современной Литвы / П. Старкус, Э. Б. Боев // История и ист. память. – 2020. – № 21. – С. 106–113.

*31. Уварова, А. В.* Отражение исторической памяти в музеях исторического профиля. Опыт Российской Федерации и стран постсоветского пространства / А. В. Уварова // Россия в глобальном мире : новые вызовы и возможности : сб. работ X Междунар. студ. науч. конф., Санкт-Петербург, 24–26 марта 2022 г. – СПб., 2023. – С. 526–535.

*32. Федорова, С. В.* Музейная педагогика как средство патриотического воспитания младших школьников / С. В. Федорова, Э. В. Фролова // Современные проблемы и перспективы развития туризма и гостеприимства в России и за рубежом : сб. ст. участников Всерос. науч.-практ. конф. с междунар. участием, Арзамас, 27–28 сент. 2022 г. / науч. ред. С. П. Акутина, Т. Т. Щелина ; отв. ред. Ю. Е. Болотин ; Арзамасский филиал ННГУ. – Арзамас, 2022. – С. 111–114.

*33. Шевцова, С. Н.* Современная работа школьных библиотек и школьных музеев по патриотическому воспитанию обучающихся / С. Н. Шевцова, О. А. Шевцова // Педагогический опыт : от теории к практике : материалы Всерос. науч.-практ. конф., Чебоксары, 12 апр. 2023 г. / редкол.: О. Н. Широков [и др.]. – Чебоксары, 2023. – С. 67–69.

*34. Шиптенко, Ю. М.* Внедрение модели нравственно-патриотического воспитания детей старшего дошкольного возраста посредством приобщения к истории и культуре / Ю. М. Шиптенко // XXIV Вишняковские чтения «Вузовская наука : условия эффективности социально-экономического и культурного развития региона» : материалы Междунар. науч. конф., Бокситогорск, 16 апр. 2021 г. / отв. ред. Е. Г. Седлецкая. – СПб., 2021. – С. 35–39.

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 04.04.2024.